У НАС НОВЫ КАЛЕГА

Згодна з рашэннем Прэзідыума Грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» ад 28 жніўня 2024 года паўнапраўным членам калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення рэспубліканскага творчага саюза стаў краязнавец, гістарычны публіцыст Аляксандр Радзівонаў.

Аляксандр Мікалаевіч Радзівонаў нарадзіўся ў 1960 годзе ў Саратаве (Расія). Скончыў Энгельскае вышэйшае зенітнае ракетнае каманднае вучылішча супрацьпаветранай абароны, Ваенную камандную акадэмію супрацьпаветранай абароны імя Г. К. Жукава. Служыў у розных ваенных акругах Савецкага Саюза. Старшыня Гродзенскай арганізацыі Беларускага грамадскага савета ветэранаў. Аўтар шматлікіх публікацый у навуковых выданнях, кнігі «Военное образование на Гродненщине: история и современность».

Аляксандр Мікалаевіч Радзівонаў

Газета «Літаратура і мастацтва» № 34 (5295) 6 верасня 2024 года